# З каталіцкага друку (159)

Аўтар: Рэдакцыя
04.03.2018 00:00

CatholicNews.by

У Бэтлееме
падрыхтуюць ружанцы
для ўдзельнікаў СДМ

***Ружанцы будуць зроблены сем'ямі, якія знаходзяцца ў патрэбе, маладымі людзьмі, што не маюць працы, бежанцамі. Гэтая ідэя з'яўляецца адказам на жаданне папы Францішка, каб моладзь далучылася да малітвы за мір.*** "Для таго, каб маліцца Ружанцам, неабходна мець сам ружанец. Было 2 магчымасці вырашыць гэтае пытанне. Па-першае, можна было замовіць танныя ружанцы з Кітая. Па-дру- гое, зрабіць ружанцы з аліўкавага дрэва, сімвала міру, якое расце ў Бэтлееме, пры дапамозе мясцовых жыхароў. І менавіта па гэтай прычыне мы абралі 2-ое рашэнне", – патлумачыў біскуп Пір Бёрчэр.

Кожны ўдзельнік Сусветных дзён моладзі атрымае 3 ружанцы: для сябе, для таго, каго сустрэне ў Панаме, і для жыхара сваёй краіны.†

Radio Vaticana

Парэшткі
Магдалены Радзівіл
перапахаваны ў Беларусі

***Прах вядомай мецэнаткі пачатку XX стагоддзя перавезены са Швейцарыі ў мінскі Касцёл Найсвяцейшай Тройцы.*** На св. Імшы, пасля якой адбылася цырымонія, прысутнічалі вернікі, пісьменнікі, грамадскія дзеячы, а таксама нашчадкі рода Радзівілаў – браты Мікалай і Мацей.

Магдалена Радзівіл нарадзілася ў Варшаве (Польшча), але з Беларуссю яе звязала шмат чаго: карані бацькоў, радавыя маёнткі, дзяцінства, шлюб з Мікалаем Радзівілам, актыўная грамадская і дабрачынная дзейнасць. У 1918 годзе княгіня пакінула Беларусь, але заўсёды марыла вярнуцца.

TYGODNIK idziemy

Калізей у колеры крыві

***У першую суботу Вялікага посту рымскі Калізей асвятлілі чырвоным колерам.***

Аўтар: Рэдакцыя
04.03.2018 00:00

***Ён павінен быў звярнуць увагу на лёс хрысціян, праследуемых у розных краінах.***
У непасрэдным суседстве з Калізеем адбыўся мітынг памяці аб вызнаўцах Хрыста, якія падвяргаюцца ганенням. У ім прынялі ўдзел, між іншым, муж і дачка Асіі Бібі – пакістанскай каталічкі, асуджанай у 2009 годзе на смерць за (нібыта) абразу ісламу.

У той жа час падобная ілюмінацыя асвяціла 2 іншыя хрысціянскія святыні ў сімвалічных месцах праследаванняў: катэдру св. Паўла ў Мосулі (Ірак) і мараніцкі касцёл св. Іллі ў Алепа (Сірыя).